# АД ВУЛІЦ ДА ЭКРАНАЎ: ЛІЧБАВЫЯ РЭПРЭСІІ Ў БЕЛАРУСІ



DISSIDENTBY

Human constanta

Гэта справаздача падрыхтавана сумесна Dissidentby і Human Constanta, дызайн вокладкі – Ксенія Дзяруга.

Капіраванне, распаўсюджванне і паказ гэтага матэрыялу дазваляюцца пры ўмове, што вы ўказваеце аўтарства Dissidentby і Human Constanta і не выкарыстоўваеце гэты матэрыял у камерцыйных мэтах.

Снежань 2025

*Гэты тэкст з'яўляецца вынікам інтэлектуальнай і аналітычнай працы аўтаркі і рэдактаркі. Ідэі, структура і змест артыкула былі цалкам распрацаваныя, напісаныя і адрэдагаваныя чалавекам. Падчас працы выкарыстоўвался ChatGPT для паляпшэння яснасці фармулёвак, дапрацоўкі асобных сказаў і праверкі лагічнай сувязі паміж думкамі. Усе штучнастворанныя кавалкі тэксту былі праверанныя, вычытаныя і апрацаваныя чалавекам перад выкарыстаннем. Усе даныя, узятыя з канкрэтных судовых спраў, уяўляюць сабой унікальную інфармацыю, задакументаваную Dissidentby.*

Email: info@humanconstanta.org
Website: https://humanconstanta.org/
Instagram: https://www.instagram.com/humanconstanta/

Email: imdissidentby@gmail.com
Website: https://dissidentby.com

# Змест


**Уводзіны** .... 4

**Эвалюцыя лічбавых рэпрэсій у Беларусі (2020–2025)** .... 5

**Практыка крымiналiзацыi анлайн-паводзiнаў у Беларусi** .... 7

- Пераслед за “абразы” службовых асоб і Прэзідэнта .... 7
- “Справа Зельцэра” .... 10
- Прыклады крымінальных прысудаў за каментары ў інтэрнэце (2021–2023) .... 12
- Антываенныя выказванні .... 13
- Пераслед за падтрымку ініцыятыў праз данаты .... 14
- Пераслед за ўдзел у лічбавых ініцыятывах і анлайн-супольнасцях .... 16
- Крыміналізацыя дэананімізацыі і спробаў прыцягнення да адказнасці сілавікоў .... 19
- Рэпрэсіі супраць журналіст_ак .... 20
- Рэпрэсіі супраць сваякоў палітзняволеных .... 21

**Статыстыка 2020-2025. Прававы каментар** .... 22

**Заключэнне. Наступствы і тэндэнцыі** .... 26

- Самацэнзура праз “лічбавы страх” .... 26
- Выцісканне за мяжу і фрагментацыя супольнасцяў .... 26
- Перанос актывізму ў “цёмныя зоны” .... 27
- Лічбавы разрыў .... 27
- Сістэмныя рэпрэсіі супраць анлайн-актыўнасці .... 27
- Інфармацыйная дэфіцытнасць .... 28
- Выцясненне з грамадзянскай актыўнасці .... 28

# Ад вуліц да экранаў: лічбавыя рэпрэсіі ў Беларусі

## Уводзіны

Пяць гадоў пасля масавых пратэстаў 2020 года Беларусь застаецца прасторай сістэмных палітычных рэпрэсій – магчыма, адных з самых інтэнсіўных у Еўропе. Але характар гэтых рэпрэсій істотна змяніўся. Калі раней асноўным аб’ектам ціску былі ўдзельнікі вулічных дэманстрацый, то цяпер поле прымусу ўсё часцей зрушаецца ў лічбавую сферу. У сітуацыі, калі значная частка актывіст_ак пакінула краіну, а публічная вулічная актыўнасць зведзена да мінімуму, улада адаптуе механізмы кантролю, перамяшчаючы іх туды, дзе працягваецца супраціў – у інтэрнэт.

Паводле дадзеных *Dissidentby*, з 2020 года ў Беларусі ўзбуджана больш за 3476 крымінальных спраў, у якіх фігуруюць абвінавачанні, звязаныя з анлайн-актыўнасцю; 2861 чалавек быў асуджаны. Акрамя таго, зафіксавана як мінімум 8687 адміністрацыйных спраў па артыкуле 19.11 КаАП Рэспублікі Беларусь, які выкарыстоўваецца для пакарання за “*распаўсюд экстрэмісцкіх матэрыялаў*” у інтэрнэце. Для параўнання, у Расіі зафіксавана каля 1100 антываенных крымінальных спраў і больш за 200 пераследаў за выказванні ў інтэрнэце з лютага 2022 па снежань 2024.[3]

У больш шырокім кантэксце рэгіёна падаўленне лічбавых свабод становіцца агульнай тэндэнцыяй. Як паказвае глабальны рэйтынг *Freedom on the Net* арганізацыі *Freedom House*, урады ўсё часцей выкарыстоўваюць тэхналогіі для маніторынгу, цэнзуры і крыміналізацыі анлайн-актыўнасці – тое, што даследчыкі называюць “лічбавым аўтарытарызмам”. Падобныя працэсы назіраюцца ў Азербайджане і Казахстане, а таксама ў Грузіі, якая раней лічылася адносна свабоднай, але апошнія гады адзначаюцца прыкметы рэзкага пагаршэння становішча. Аднак Беларусь у гэтым кантэксце вылучаецца масштабам і інтэнсіўнасцю рэпрэсій: краіна апярэджвае большасць суседзяў паводле ўзроўню крыміналізацыі анлайн-паводзінаў, ператвараючы антыэкстрэмісцкае заканадаўства ў галоўны інструмент палітычнага кантролю.

Лічбавая прастора, якая раней успрымалася як адносна бяспечная зона камунікацыі і салідарнасці, паступова ператвараецца ў арэну крымінальнага пераследу. За апошнія гады ў Беларусі склалася ўстойлівая практыка пакаранняў за анлайн-дзейнасць: ад адміністрацыйных штрафаў за «лайкі» і

рэпосты да шматгадовых тэрмінаў зняволення за донаты або ўдзел у інтэрнэт-праектах. Улады ўсё часцей выкарыстоўваюць гнуткія фармулёўкі антыэкстрэмісцкага заканадаўства – «*заклікі да дзеянняў, якія нясуць шкоду нацыянальнай бяспецы*», «*удзел у экстрэмісцкім фармаванні*», «*фінансаванне экстрэмісцкай дзейнасці*» – каб пашырыць межы дапушчальнага пакарання і надаць прававую форму палітычнаму гвалту. У выніку прававая сістэма пачынае працаваць як механізм лічбавага запалохвання, дзе кожны клік, ахвяраванне або каментар можа разглядацца як злачынства.

Мэта гэтага аналізу – паказаць, як беларуская ўлада інтэрпрэтуе і ўжывае заканадаўства, каб пашыраць межы пакарання за выказванні і грамадзянскую актыўнасць у сеціве, а таксама суаднесці беларускую практыку з міжнароднымі стандартамі свабоды выказвання, якія патрабуюць, каб любыя абмежаванні былі прапарцыйнымі, неабходнымі і празрыстымі. Гэты падыход дазваляе ацаніць, як за апошнія гады змянілася свабода выказвання ў інтэрнэце і якія новыя рызыкі нясе анлайн-дзейнасць у аўтарытарным кантэксце.

## Эвалюцыя лічбавых рэпрэсій у Беларусі (2020–2025)

Пасля выбараў і масавых пратэстаў 2020 года рэпрэсіі ў Беларусі спачатку мелі выразна вулічны характар. Тысячы людзей былі затрыманыя за ўдзел у дэманстрацыях, за бел-чырвона-белыя сцягі, за фатаграфіі на плошчах ці нават за вопратку “няправільнага” колеру. Аднак ужо ў канцы 2020-пачатку 2021 года рэпрэсіўны фокус пачаў зрушацца ў анлайн-прастору.

Доступ да інтэрнэту мае пераважная большасць насельніцтва краіны, таму менавіта анлайн стаў натуральнай пляцоўкай для камунікацыі, абмеркавання грамадскіх падзей і пошуку аднадумцаў. У 2020 годзе праз былі створаны і дзейнічалі праекты «Голас» (альтэрнатыўны падлік галасоў), «Честные люди» (маніторынг выбараў і затрыманняў), «Зубр» (каардынацыя назіральнікаў і збор сведчанняў пра парушэнні), а таксама ініцыятывы «Окрестина задержанные» і «Август2020», якія сістэматызавалі інфармацыю пра затрыманых і ахвяраў гвалту. Інтэрнэт ператварыўся ў адну з ключавых прастораў грамадзянскай самаарганізацыі і, адпаведна, у новую мішэнь для дзяржаўнага кантролю.

У жніўні 2020 года ўлады мэтанакіравана абмяжоўвалі доступ да сеткі, уводзілі фільтрацыю і тармажэнне трафіку, выкарыстоўваючы тэхналогіі DPI для

блакавання незалежных рэсурсаў і мэсэнджараў. Пры гэтым гэтыя тэхнічныя сродкі прымяняліся не толькі падчас масавых пратэстаў, але і лакальна перад адраснымі затрыманнямі. Праваабаронцы фіксавалі выпадкі, калі ў асобных раёнах або на ўзроўні канкрэтных карыстальнікаў часова адключаўся інтэрнэт, каб затрыманы чалавек не паспеў паведаміць пра ўварванне або выйсці з уліковых запісаў.

У наступныя гады метады лічбавага кантролю сталі часткай следчай практыкі, напрыклад, дадзеныя білінгу выкарыстоўваліся як "доказ прысутнасці" на акцыях нават без фота- ці відэасведчанняў. Адначасова сілавікі пачалі выкарыстоўваць лічбавыя інструменты не толькі для маніторынгу, але і для правакацый. Адным з найбольш паказальных выпадкаў стала так званая "справа аб падпалах табакерак" 2021 года. Паводле сведчанняў сваякоў асуджаных і матэрыялаў праваабаронцаў, абвінавачанне базавалася на паказаннях аднаго ўдзельніка чата, які, паводле іх звестак, мог выступаць у ролі правакатара. Ён прапаноўваў адрасы для дзеянняў, перадаваў інфармацыю пра месцы без камер назірання і пазней стаў асноўнай крыніцай доказаў у судзе. На падставе гэтых паказанняў больш дзесяць чалавек былі асуджаныя на тэрміны ад пяці да дзевяці гадоў пазбаўлення волі. Такія кейсы паказваюць, як лічбавая прастора выкарыстоўваецца для кантралю і дыскрэдытацыі грамадзянскіх сетак супрацыву.

Пасля пачатку вайны Расеі супраць Украіны ў 2022 годзе рэпрэсіі набылі новы змест. Антываенныя выказванні трактаваліся як "дыскрэдытацыя дзяржавы" або "распальванне варожасці". У гэты час з'явіліся і новыя метады анлайн-пераследу. Сілавікі пачалі актыўна выкарыстоўваць чат-рулеткі і правакацыйныя перапіскі, у якіх супрацоўнікі або іх давераныя асобы ўступалі ў размовы з грамадзян_камі, схіляючы іх да антываенных каментароў ці крытыкі ўладаў, каб потым выкарыстаць гэта як падставу для крымінальнай справы. Маніторыліся таксама замежныя анлайн-супольнасці, дзе маглі выказвацца беларусы – напрыклад, пад відэа ўкраінскіх блогераў. Акрамя таго, зафіксаваныя выпадкі, калі сілавікі выкарыстоўвалі тэлефоны затрыманых, каб ад іх імя ўступаць у боты, падпісвацца на Telegram-каналы ці адпраўляць паведамленні, ствараючы "доказ" іх датычнасці да "экстрэмісцкай дзейнасці". Такія дзеянні дазвалялі ўладам ствараць штучныя падставы для пераследу і пашыраць маштаб крыміналізацыі анлайн-паводзінаў.

З 2022–2023 гадоў рэпрэсіі сталі сістэмнымі і амаль аўтаматызаванымі. Суды працуюць па шаблонах, а спісы "экстрэмісцкіх фармаванняў" і "экстрэмісцкіх матэрыялаў" абнаўляюцца амаль штомесяц. Паводле афіцыйнага рэестра МУС, з 2020 па 2025 год колькасць пазіцый у Рэспубліканскім спісе экстрэмісцкіх матэрыялаў павялічылася з 128 да 1846, якія складаюцца з

інтэрнэт-рэсурсаў і медыя, у тым ліку Telegram-каналы, YouTube-старонкі, грамадзянскія ініцыятывы і нават лакальныя чаты.

У 2023-2025 гадах сістэма пераследу яшчэ больш удасканалілася. Улады пачалі актыўна выкарыстоўваць артыкулы 361-1, 361-2 і 361-4 Крымінальнага кодэкса, якія дазваляюць прыцягваць да адказнасці не толькі за дзеянні, але і за "ўдзел" ці "садзейнічанне" ў дзейнасці экстрэмісцкага фармавання. У выніку крыміналізуецца практычна ўсё – ад ахвяраванняў да адміністравання чата або падпіскі на Telegram-канал.

Гэтая паступовая трансфармацыя адлюстроўвае ператварэнне Інтэрнэта ў прастору, дзе кожнае слова, фота ці рэакцыя можа стаць падставай для пераследу.

# Практыка крыміналізацыі анлайн-паводзінаў у Беларусі

## Пераслед за "абразы" службовых асоб і Прэзідэнта

*арт. 367, 368, 369, 391 КК РБ*

З 2020 года крымінальныя артыкулы, звязаныя з "абразай" і "паклёпам", сталі аднымі з самых ужываемых у рэпрэсіўнай практыцы Беларусі. Паводле дадзеных праваабаронцаў *Dissidentby*, не менш за **2799 чалавек** падвергліся крымінальнаму пераследу за каментары, публікацыі або паведамленні ў сацыяльных сетках.

Асабліва жорстка караліся выпадкі, калі анлайн-актыўнасць была звязаная з крытыкай дзеянняў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. У такіх справах амаль заўсёды прызначалася мера пакарання ў выглядзе пазбаўлення волі, у той час як за абразы іншых службовых асоб (артыкулы 369 і 391) часцей прызначалася абмежаванне волі – з накіраваннем або без яго. Пры гэтым на характар пакарання істотна ўплывала колькасць эпізодаў і характар каментароў, што на практыцы дазваляла органам следства і судам фарміраваць узровень пакарання зыходзячы з палітычнай мэтазгоднасці, а не прававой аргументацыі.

Асноўныя артыкулы Крымінальнага кодэкса, якія выкарыстоўваюцца для такіх спраў:

- **арт. 367** *"Паклёп у адносінах да Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, у тым ліку спыніўшага выкананне сваіх паўнамоцтваў"*;
- **арт. 368** *"Абраза Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, у тым ліку спыніўшага выкананне сваіх паўнамоцтваў"*;
- **арт. 369** *"Абраза прадстаўніка ўлады"*;
- **арт. 391** *"Абраза суддзі або народнага засядацеля"*.

Як сведчыць фармулёўка аднаго з прысудаў:

> *"Размещенные комментарии Х. с оскорблениями в адрес действующего Президента Республики Беларусь* ***носят публичный характер, так как размещены для всеобщего обозрения в глобальной компьютерной сети Интернет****. Содержащиеся в записи оскорбления противоречат установленным правилам общения между людьми, требованиям общечеловеческой морали, унижают честь и достоинство главы государства, подрывают в глазах лиц, до сведения которых доведена запись, его авторитет, личные и профессиональные качества, а также авторитет государственной власти в целом"*.

Такія фармулёўкі паказваюць, што дзяржаўныя органы інтэрпрэтуюць крытыку як дзеянне, якое падрывае аўтарытэт улады, а судовая рыторыка ў гэтых справах звычайна апелюе да катэгорый "агульначалавечай маралі" і "аўтарытэту дзяржаўнай улады", замяняючы юрыдычныя крытэры палітычнымі або маральнымі ацэнкамі. Гэта стварае юрыдычную прастору, у якой любая негатыўная ацэнка дзеянняў улады можа быць прызнаная абразай.

Ужо ў 2021 годзе пачалі з'яўляцца масавыя крымінальныя справы за каментары ў сацыяльных сетках. Менавіта тады сфармавалася новая мадэль рэпрэсій і "злачынства слова" стала асобным напрамкам дзяржаўнай палітыкі. Судовыя працэсы суправаджаліся лінгвістычнымі "экспертызамі", якія прызнавалі абразлівымі нават фразы без прамой лаянкі. Такія экспертызы праводзяцца не незалежнымі спецыялістамі, а пераважна лаяльнымі супрацоўнікамі дзяржаўных ВНУ або адукацыйных устаноў, што ператварае іх у інструмент палітычнай ацэнкі. Па ўсёй краіне гэта адбываецца ў канвеерным рэжыме: практычна любы кантэнт, які супярэчыць афіцыйнаму дыскурсу, прызнаецца "экстрэмісцкім" у паскораным парадку, без прафесійнага аналізу і празрытых працэдур.

Тыповыя фармулёўкі судовых рашэнняў дэманструюць, як улады выкарыстоўваюць “лінгвістычныя экспертызы” для крыміналізацыі звычайных выказванняў у інтэрнэце.  У адным з прысудаў адзначаецца:

> *“Протоколом осмотра указанных публикаций с участием специалиста в области фоноскопических и лингвистических экспертиз, которым установлено, что в них содержатся изображения, текст, имеющие негативно-оценочное значение, и имеют ненормативную форму речевого выражения (л.д. *-*, *-*)[1]. Заключением эксперта №*** от **.**.****, согласно которому размещенные Б. в социальной сети О.: публикация от **.**.****содержит изображение, в котором отражено сравнение государственных символов Республики Беларусь с символикой Г. *** гг.[2], что является неприемлимым с точки зрения современной культуры, публикация от **.**.****[3] отражает сравнение Республики Беларусь со страной основанной на нацистской идеологии (на что указывает размещение герба Республики Беларусь на нацистской свастике, а также фон изображения, выполненный в виде государственного флага), что является неприемлемым с точки зрения современной культуры, публикации от **.**.****, **.**.****, **.**.****, а также публикации в виде файлов видеоизображения в отношении Президента Республики Беларусь, которые также имеют неприемлемую форму использования (л.д. *-*, *-*)”.*

У іншым рашэнні суд тлумачыць “злачынства слова” наступным чынам:

> *“...избрав способ распространения таких сведений, рассчитанный на ознакомление широкого неопределенного круга лиц, а именно в глобальной компьютерной сети Интернет, с аккаунта под псевдонимом «Д.» (id***) в чате под названием «К.» в мессенджере «Т.» доступном для просмотра другими пользователями указанного Интернет-ресурса, рассчитывая на последующее восприятие иными лицами оскорбительной информации, осознавая публичный и унизительный характер своего высказывания, с целью причинения ущерба авторитету государственной власти и управлению, после просмотра в публичном доступе в указанном Telegram чате публикации администратора указанного чата, содержавшей изображение, на котором запечатлён Министр *** И., который является представителем государственной власти и находится под защитой государства, разместил в открытом доступе сообщение, противоречащее общечеловеческой морали, установленным правилам общения между*

[1] «л.д.» — лист(ы) дела;
[2] «Г. *** гг.» — обезличенное упоминание о государстве и годах (вероятно, Германия 1941–1945 гг.).
[3] «..****» — дата

*людьми, содержащее высказывание, выраженное в неприличной форме, унижающее честь и достоинство, в котором согласно заключения судебно-лингвистической экспертизы №***, негативно оценивается И*".

Як бачна з прыведзеных фармулёвак, у беларускіх судах "экспертыза" часта ператвараецца ў палітычную інтэрпрэтацыю мовы. Суд не аналізуе кантэкст, а выкарыстоўвае агульныя катэгорыі як "*агульначалавечая мараль*", "*непрыстойная форма*", "*падрыў аўтарытэту дзяржаўнай улады*". Пры гэтым заключэнні робяцца лаяльнымі спецыялістамі дзяржаўных ВНУ, што выключае магчымасць незалежнага аналізу. Паводле юрыста ПЦ *"Вясна"*, у большасці выпадкаў лінгвістычныя экспертызы маюць фармальны характар і не адпавядаюць стандартам доказнасці. У выніку ўзмацняецца тэндэнцыя да самацэнзуры, калі грамадзян_кі адмаўляюцца ад адкрытых выказванняў у інтэрнэце, што прыводзіць да скарачэння ўдзелу ў публічнай камунікацыі і звужэння грамадскай дыскусіі.

## "Справа Зельцэра"

*арт. 369-1, 130 ч.1 КК РБ*

Пасля 2020 года, калі артыкулы аб "абразах" сталі аднымі з самых ужываемых у крымінальнай практыцы, асобныя рэзанансныя падзеі выклікалі асабліва жорсткую рэакцыю сілавых структур і масавыя затрыманні. Адным з першых такіх выпадкаў стала *"справа Зельцэра"*, якая паказала, як адзін каментар у інтэрнэце можа стаць падставай для крымінальнага пераследу.

Увечары 28 верасня 2021 года Камітэт дзяржаўнай бяспекі (КДБ) паведаміў пра смерць аднаго са сваіх супрацоўнікаў, застрэленага падчас аперацыі затрымання "асабліва небяспечнага злачынцы". Паводле афіцыйнай версіі, стрэл быў зроблены з паляўнічага ружжа. Супрацоўнік КДБ памёр у бальніцы, а чалавек, які страляў, быў забіты на месцы. Ім аказаўся супрацоўнік IT-кампаніі *EPAM* Андрэй Зельцэр. Відэа інцыдэнту хутка распаўсюдзілі дзяржаўныя СМІ, сцвярджаючы, што яго здымала жонка Зельцэра Марыя Успенская, якая неўзабаве была арыштаваная і змешчаная ў СІЗА. Гэтыя падзеі выклікалі шырокі грамадскі рэзананс у сацыяльных сетках. Ужо праз некалькі дзён пачаліся масавыя затрыманні людзей, якія выказвалі спачуванне сям'і Зельцэра або крытыку дзеянняў сілавікоў. Паводле праваабаронцаў, было зафіксавана як мінімум 135 крымінальных спраў у сувязі з каментарамі ў інтэрнэце. Былыя палітвязні адзначалі, што паміж момантам публікацыі каментару і затрыманнем часта праходзіла менш за

суткі. Затрыманні працягваліся ад моманту падзеі да 2024 года – супраць тых, хто вярнуўся ў краіну пасля эміграцыі. Сярэднія тэрміны пакарання складалі ад аднаго да трох гадоў пазбаўлення волі, і на сярэдзіну 2025 года 117 чалавек ужо адбылі пакаранне і былі вызваленыя.

У большасці выпадкаў у абвінавачанні выкарыстоўвалася арт. 369-1 КК РБ "Дыскрэдытацыя Рэспублікі Беларусь", якая дазваляе караць за выказванні, што нібыта "падрываюць аўтарытэт дзяржавы". У выніковай частцы аднаго з прысудаў адзначаецца:

> *".... с целью демонстрации неограниченному кругу лиц заведомо ложных сведений об одобрении и героизации гражданами Р. Б. совершенного З. преступления, а также осуждения действий сотрудников КГБ, преподнося их как неправомерные, **подрывая авторитет КГБ**, как республиканского органа государственного управления, дискредитации Республики Беларусь, социально-психологическая направленность которого связана с формированием положительного образа З. и негативного отношения к сотрудникам КГБ, то есть распространил заведомо ложные сведения о правовом положении граждан Р. Б., деятельности государственных органов, дискредитирующие Республику Беларусь"*

Іншы фрагмент прысуду тлумачыць дзеянні як матываваныя "палітычнай і ідэалагічнай варожасцю":

> *"Так, по делу достоверно установлено, что обвиняемый, реализуя преступный умысел и общую цель, направленные на распространение заведомо ложных сведений о правовом положении граждан в Р. Б., деятельности государственных органов, дискредитирующих Республику Беларусь, предвидя и желая наступления последствий в виде причинения существенного вреда государственным и общественным интересам, действуя умышленно, целенаправленно, по мотивам политической и идеологической вражды, **осознавая публичность совершаемых им действий и желая их совершить, путем размещения информации в глобальной компьютерной сети Интернет** (далее - сеть Интернет), используя в качестве предлога информацию об убийстве **.**.**** сотрудника Комитета государственной безопасности Республики Беларусь (далее - КГБ) Ф., которая в этот же день и в последующие дни широко освещалась в средствах массовой информации и на различных ресурсах в сети Интернет".*

Асобна паказальны выпадак Марыі Успенскай, удавы Андрэя Зельцэра. Яна была арыштаваная і змешчаная ў СІЗА, дзе, паводле непублічных сведчанняў

былых вязняў, падвяргалася каральнай медыцыне. 16 чэрвеня 2022 года суддзя Мінскага гарадскога суда Валянціна Зянькевіч () прызнала удаву падлягаючай прымусоваму лячэнню ў псіхіятрычным стацыянары і пастанавіла спагнаць 100 000 беларускіх рублёў на карысць удавы загінулага супрацоўніка КДБ. Такім чынам, Успенская была ізаляваная і не магла адкрыта сведчыць пра абставіны трагедыі. Паводле адкрытых крыніц, на верасень 2025 года яна застаецца ў псіхіятрычнай клініцы “Новінкі” і пазбаўленая магчымасці выхоўваць свайго непаўналетняга сына.

Гэты кейс стаў прыкладам калектыўнага пакарання і поўнага кантролю дзяржавы над інтэрпрэтацыяй грамадскіх падзей у анлайн-прасторы. Праз крыміналізацыю каментароў улады ліквідавалі любую альтэрнатыўную дзяржаунай версію таго, што адбылося.

## Прыклады крымінальных прысудаў за каментары ў інтэрнэце (2021–2023)

| **Кейс (каментары)** | **Артыкул КК РБ** | **Год** | **Прысуд** |
|---|---|---|---|
| “Иуда” | 369 | 2022 | 2,5 гады абмежавання волі без накіравання ў ПУАТ, штраф 1000 б.р. |
| Прэзідэнт названы “балаболам” (у ненарматыўнай форме) | 368 ч.1 | 2023 | 1 год пазбаўлення волі |
| "что ни рожа, то парася" | 369 | 2023 | 1,5 гады абмежавання волі з накіраваннем у ПУАТ, штраф 3700 б.р., маральная кампенсацыя 2000 б.р. |

| | | | |
|---|---|---|---|
| “Так этим тварям режимным и надо. Парня жалко” | 369-1<br>130 ч.1 | 2022 | 3 гады пазбаўлення волі |
| “в стране страшнее, чем в Сомали»<br><br>“если бы было у меня ружье и ко мне ломались бы такие люди, я бы тоже защищал свой дом, только бы баррикады сделал” | 369-1 | 2022 | 2 гады пазбаўлення волі |
| "Народ открыл счет". | 130 ч.1 | 2022 | 3,5 гады пазбаўлення волі |
| "Устроил терроризм и геноцид в стране, еще и оккупацией занялись". | 367 ч.1 | 2022 | 2 гады пазбаўлення волі |
| “Такія Хероі і хай увесь свет пачакае”. | 369 | 2021 | 2 гады абмежавання волі без накіравання ў ПУАТ |
| "Андрей Зельцер у себя в квартире защищал свой дом, свою семью от неизвестных людей, которые выломали дверь при помощи топора. Он защищался, как умел...". | 130 ч.1 | 2022 | 1 год і 2 месяцы пазбаўлення волі |

Гэтыя прыклады ілюструюць відавочную дыспрапорцыю паміж характарам выказванняў і жорсткасцю прызначаных пакаранняў. Большасць каментароў носяць эмацыйны або ацэначны характар і не ўтрымліваюць заклікаў да гвалту, аднак улады трактаваць іх як злачынствы супраць дзяржаўнай улады або грамадскай маралі. Судовыя прысуды дэманструюць, што крыміналізацыя мовы ў Беларусі дасягнула ўзроўню, калі нават адзін каментар у сацсетцы можа прывесці да пазбаўлення волі.

## Антываенныя выказванні

*арт. 368 ч.1, 130 ч.1 КК РБ*

Пасля ўварвання расійскіх войскаў ва Украіну ў 2022 годзе адным з найбольш распаўсюджаных кірункаў крымінальнага праследу ў Беларусі стаў пераслед за выказванне антываеннай пазіцыі. Для "пошуку" такіх людзей сілавыя структуры пачалі актыўна выкарыстоўваць чат-рулетку (ананімны відэачат для камунікацыі). Паводле праваабаронцаў, суразмоўцамі карыстальнікаў часта аказваліся правакацыйныя асобы, якія мэтанакіравана наводзілі размову на тэмы вайны, улады або палітыкі, прымушаючы чалавека адкрыта выказацца. Размовы запісваліся на відэа, пасля чаго з дапамогай OSINT-метадаў (адсочванне профіляў у сацыяльных сетках, аналіз фона, тэхнікі, мовы) ідэнтыфікаваліся ўдзельнікі. Далей па месцы пражывання выязджалі аператыўныя групы, і людзей затрымлівалі паводле арт. 368 ч.1 КК РБ і арт. 130 ч.1 КК РБ. Паводле дадзеных *Dissidentby*, вядома як мінімум 12 такіх выпадкаў; у 10 выпадках лёс людзей застаецца невядомым, нягледзячы на тое, што іх звесткі былі апублікаваныя ў праўладных сацыяльных сетках з заявай пра іх "затрыманне".

Адным з найбольш вядомых стаў выпадак Дзмітрыя Лагуценка, жыхара Рагачова. Ён быў затрыманы разам з сябрам, ім надзелі на галаву бел-чырвона-белыя сцягі і прымусілі мыць імі падлогу. Пасля затрымання Лагуценка змясцілі ў СІЗА, а затым асудзілі на тры гады пазбаўлення волі і ўключылі ў "спіс тэрарыстаў". Праз паўтара года ён трапіў пад прэзідэнцкае "памілаванне" і быў вызвалены.

Гэты кейс паказальны тым, што ўлады не проста рэагуюць на ўжо зробленыя анлайн-выказванні, а намерна ствараюць умовы, каб гэтыя выказванні справакаваць. У выпадку з чат-рулеткай дзяржава пераходзіць ад назірання да актыўнага ўдзелу ў камунікацыі, прымушаючы людзей гаварыць тое, што потым становіцца падставай для крымінальнага пераследу.

## Пераслед за падтрымку ініцыятыў праз данаты

*арт. 361-2 ч.1 і ч.2, 361-3 ч.1 і ч.2, 361-4 ч.1 і ч.2, 290-1 ч.1 і ч.2 КК РБ*

Пасля таго як крымінальны пераслед за каментары і анлайн-выказванні стаў звыклай практыкай, улады пашырылі межы кантролю на сферы

грамадзянскай салідарнасці. Наступным этапам стаў пераслед за данаты, калі пакаранне пачало наступаць за любыя спробы матэрыяльна падтрымаць пацярпелых, медыя, гуманітарныя або грамадзянскія ініцыятывы, якія пазней прызнаваліся “экстрэмісцкімі” або “тэрарыстычнымі”. Пасля 2021 года ў Беларусі пачалася сістэмная кампанія прызнання ініцыятыў і арганізацый “экстрэмісцкімі фармаваннямі”. У спіс траплялі не толькі грамадзянскія супольнасці, але і праваабарончыя, медыйныя і гуманітарныя праекты. Гэта зрабіла практычна любую фінансавую падтрымку рызыкоўнай, калі нават сімвалічны пералік мог стаць падставай для крымінальнай справы.

Самі выпадкі праследу за данаты маюць шэраг спецыфічных рысаў. *Па-першае*, калі сілавікі выяўляюць факт пераліку сродкаў на карысць прызнанай “экстрэмісцкай” ініцыятывы, чалавека выклікаюць у КДБ, дзе дамагаюцца прызнання віны і прапануюць “кампенсаваць шкоду” у сярэднім у дзесяціразовым памеры ад сумы пераліку. Па сведчаннях пацярпелых, гэтая “кампенсацыя” не рэгулюецца дакументальна і не гарантуе бяспеку або спыненне праследу. Нярэдка людзі, якія ўжо заплацілі “кампенсацыю”, праз некаторы час былі паўторна затрыманыя і асуджаныя па крымінальных артыкулах за тое ж ахвяраванне.

*Па-другое*, істотны аспект – гэта непрапарцыйнасць пакарання. У адным з прысудаў зафіксаваны выпадак, калі чалавек спрабаваў зрабіць ахвяраванне на суму 16.17 долараў ЗША (47 рублёў 59 капеек), якая ў выніку нават не дайшла да атрымальніка і была вернута банкам. Тым не менш, суд прызнаў гэта “спробай садзейнічання экстрэмісцкай дзейнасці” і асудзіў яе аўтарку на тры гады пазбаўлення волі:

> *“..... действуя умышленно, пыталась перечислить на банковскую платежную карту №*** ***, эмитированную JSC U., находящуюся в пользовании представителей экстремистского формирования «П.», денежные средства в размере 16.17 долларов С., что по курсу Национального банка Республики Б. на дату совершения преступления составило 47 рублей 59 копеек (1,5 БВ), тем самым, П. покушалась на предоставление денежных средств любым способом для* ***заведомого обеспечения экстремистской деятельности****, при этом, ей таковые в последующем были* ***возвращены банком-эмитентом*** *ввиду запрета по осуществлению указанной банковской операции.*
>
> *….. Утверждения П. о том, что она не имела умысла на предоставление денежных средств любым способом для заведомого обеспечения экстремистской деятельности, поскольку «П.» на момент совершения деяния не был признан экстремистским формированием, являются*

> *необоснованными, так как **о деструктивности данного формирования свидетельствует информация, размещенная в свободном доступе в интернете**, а также ее показания о понимании того, что помогает состоявшим в нем гражданам Р. Б., которые участвовали в боевых операциях на стороне У., данные ею в ходе предварительного следствия*".

Гэты фрагмент прысуду паказвае, што беларускія суды фактычна аперыруюць не юрыдычнымі, а палітычнымі катэгорыямі. Замест неабходнасці даказаць наўмыснасць або шкоду дзяржаве выкарыстоўваюцца фармулёўкі кшталту *«деструктивность формирования»* або *«информация в свободном доступе»*.

*Трэці элемент* пераследу – прымяненне зваротнай сілы закона. Людзей прыцягваюць да адказнасці за пераклады, зробленыя да таго, як арганізацыя ці ініцыятыва была прызнаная "экстрэмісцкай". Паказальны выпадак – справа IT-спецыяліста Аляксандра Зіязэдзінава, які ў траўні 2021 года зрабіў ахвяраванне ў падтрымку BYPOL. Арганізацыя была прызнаная "экстрэмісцкай" толькі ў лістападзе таго ж года, аднак у 2022 годзе Аляксандра асудзілі на тры гады пазбаўлення волі. Праз год, калі BYPOL быў ужо прызнаны "тэрарыстычнай арганізацыяй", на яго завялі новую справу, і ў 2024 годзе суд прысудзіў яшчэ дзевяць гадоў зняволення.

Такія выпадкі дэманструюць, як дзяржава крыміналізуе сам акт салідарнасці, незалежна ад яго рэальнага ўплыву ці моманту здзяйснення. Данаты ў Беларусі ператварыліся з формы падтрымкі ў доказ "удзелу ў экстрэмісцкай дзейнасці", што адлюстроўвае тэндэнцыю да поўнай крыміналізацыі грамадзянскай супольнасці.  У выніку фінансавая падтрымка стала ўспрымацца як акт палітычнай нелаяльнасці, а грамадзянская салідарнасць як злачынства.

## Пераслед за ўдзел у лічбавых ініцыятывах і анлайн-супольнасцях

*арт. 361-1, 361-2, 361-4 КК РБ*

У той час, калі ўнутры краіны адбывалася сістэмная "зачыстка" грамадзянскай актыўнасці, у рэгіёне разгортваліся падзеі, якія патрабавалі новай рэакцыі і ўключэння беларускага грамадства. Поўнамаштабнае ўварванне Расіі ва Украіну ў 2022 годзе стала каталізатарам развіцця новых формаў анлайн-супраціву ад валанцёрскіх сетак да маніторынгавых OSINT-праектаў. Беларускае грамадства праявіла актыўную антываенную

пазіцыю, якая выяўлялася не толькі ў вулічных акцыях і выказваннях у сацыяльных сетках, але і ў стварэнні інфармацыйных ініцыятыў, арыентаваных на збор і распаўсюд фактаў вайны.

Найбольш вядомым прыкладам стаў праект «Беларускі Гаюн», які меў каля 345 тысяч падпісчыкаў і аб'ядноўваў карыстальні_ц з усёй краіны, што перадавалі звесткі пра перамяшчэнні вайсковай тэхнікі, авіяпералёты, чыгуначныя перавозкі і іншыя ваенныя рухі. Гэта дазваляла хутка збіраць і аналізаваць адкрытыя дадзеныя, робячы іх даступнымі для грамадскасці, журналістаў і аналітыкаў. На пачатку лютага 2025 года сілавыя структуры атрымалі доступ да чатаў і чат-бота праекта, а таксама да часткі даных карыстальнікаў. Праз некалькі дзён пачаліся масавыя затрыманні людзей, якія дасылалі фота ці відэа з тэхнікай. У выніку «Беларускі Гаюн» быў вымушаны абвясціць пра спыненне дзейнасці.

Паводле дадзеных ПЦ *«Вясна»*, вядома не менш як пра 122 затрыманых і асуджаных у сувязі з «справай Гаюна». У большасці выпадкаў людзей абвінавачвалі паводле арт. 361-4 КК РБ ("садзейнічанне экстрэмісцкай дзейнасці"), прысуджаючы тэрміны ад трох да пяці гадоў пазбаўлення волі або да чатырох гадоў абмежавання волі з накіраваннем у ПУАТ ці без яго. У адным з прысудаў суд тлумачыць дзеянні абвінавачанага наступным чынам:

> *"*** в точно неустановленный период времени, но не позднее 16⁵⁰ 10 февраля 2023 г., находясь на территории Республики Беларусь и г. ** (более точное место не установлено), имея* ***умысел на иное содействие экстремистской деятельности, в том числе выражающееся в несогласии с проведением Российской Федерацией специальной военной операции*** *на территории Республики Украины по демилитаризации и денацификации с целью защиты мирного населения, являясь пользователем под учетной записью «» ….. и telegram-бота «Дапаможа Гаюн», входящего в структуру telegram-канала «Беларускі Гаюн» (в настоящее время «Беларускі Гаюн | Belarusian Hajun project») которого, согласно решению суда Центрального района г. Минска от 18 марта 2022 г., признана экстремистскими материалами, а в отношении самой группы — МВД Республики Беларусь, на основании Закона Республики Беларусь от 4 января 2007 г. № 200-З «О противодействии экстремизму» (с изменениями и дополнениями), принято решение от 16 марта 2022 г. № 10ЭК о признании указанной группы экстремистским формированием..."*

Такія фармулёўкі паказваюць, што беларускія суды не толькі пераймаюць рыторыку дзяржаўнай расійскай прапаганды, але і фактычна інтэгруюць яе ў юрыдычныя тэксты. У прысудах з'яўляюцца фармулёўкі, якія паўтараюць крамлёўскія наратывы пра "*специальную военную операцию*",

*“денацификацию”* і *“защиту мирного населения”*, і становяцца інструментам інфармацыйнай вайны ў рэгіёне.

З самага пачатку пратэстаў 2020 года інтэрнэт, асабліва сацыяльныя сеткі і мэсэнджары, стаў асноўнай прасторай для каардынацыі і абмену інфармацыяй. У розных гарадах і раёнах узнікалі сотні лакальных і дэцэнтралізаваных чатаў ад “дваровых” груп да закрытых каналаў для некалькіх чалавек. Яны выкарыстоўваліся для абмеркавання падзей і самаарганізацыі. Пастулова з’яўляліся і больш структураваныя анлайн-ініцыятывы, чат-боты і платформы, якія прапаноўвалі адносна бяспечныя формы ўдзелу ў грамадзянскім жыцці, у тым ліку для каардынацыі дзеянняў і ўзаемнай падтрымкі. Аднак у практыцы беларускіх уладаў нават удзел у такіх чатах і камунікацыя з ботамі пачалі трактавацца як *“садзейнічанне экстрэмісцкай дзейнасці”*. Адміністрацыйныя функцыі, звычайная мадэрацыя ці распаўсюд інфармацыі ў межах супольнасці інтэрпрэтуюцца як “*кіраванне экстрэмісцкім фармаваннем*”. У адным з прысудаў суд тлумачыць дзеянні адміністратара наступным чынам:

> *“В последующем ***, осуществляя функции администратора телеграмм-канала «***», помимо удаления сообщений пользователей, которые соответствовали по своему содержанию установленным фильтрам бота, формировал состав участников телеграмм-канала, в соответствии с функциями администратора, путем их присоединения (добавления), исключения (что следует из установленного факта изменения числа участников группы), а также блокировки пользователей, поддерживавших действующий конституционный строй; формировал и корректировал новостную повестку канала, контролировал наполнение экстремистскими материалами контент канала, направленный на дискредитацию Республики Беларусь, органов государственной власти и управления, распространение заведомо ложной информации об экономическом, политическом, международном положении Республики Беларусь, содержащий публичные призывы к планированию, организации, подготовке и совершении посягательств на основы конституционного строя и общественную безопасность Республики Беларусь, тем самым* ***консолидируя и поддерживая рост радикально-протестного настроения*** *в обществе, то есть руководил экстремистской деятельностью участников телеграмм-канала «****»”.*

Сярод ініцыятыў адным з лідарам па рэпрэсіям стаў праект “Перамога” – ананімны чат-бот, праз які карыстальнікі маглі пакідаць свае кантакты, паведамляць пра гатоўнасць да ўдзелу ў будучых акцыях пратэсту або падтрымліваць каардынацыйныя структуры. Паводле дадзеных *Dissidentby*, як мінімум 39 чалавек былі затрыманыя па крымінальных артыкулах за

рэгістрацыю ў гэтым ініцыятыве. Улады трактавалі нават сам факт узаемадзеяння з “Перамогай” як “*удзел у экстрэмісцкім фармаванні*”, нягледзячы на тое, што большая частка карыстальнікаў не здзяйсняла ніякіх дзеянняў пасля таго, як націснулі кнопку “старт”. У 2025 праект быў закрыт з-за рэпрэсій і крытыкі з боку грамадзянскай супольнасці.

Асобным напрамкам рэпрэсій стала крыміналізацыя кантактаў з ініцыятывамі, якія дзейнічалі за межамі Беларусі. Да такіх адносіўся Полк імя Кастуся Каліноўскага, добраахвотніцкае ўзброенае фармаванне ў складзе Узброеных сіл Украіны. Паводле дадзеных *Dissidentby*, не менш за 29 чалавек былі затрыманыя за рэгістрацыю ў чат-боце палка ці спробу ўступлення ў яго шэрагі. Удзел у яго дзейнасці, а таксама спроба далучыцца да палка або камунікацыя з яго прадстаўнікамі ў інтэрнэце пачалі трактавацца як “*удзел у экстрэмісцкім фармаванні*” або “*садзейнічанне тэрарызму*”. Адным з прыкладаў стаў прысуд, у якім чалавек быў асуджаны за спробу зарэгістравацца праз адпаведны чат-бот. Судовая фармулёўка паказвае, што нават перапіска або намер прыняць удзел у такой ініцыятыве разглядаецца як завершанае злачынства:

> “*Он же, являясь гражданином Республики Беларусь, не ранее 24 февраля 2022 года, находясь на территории Республики Беларусь, в том числе в г. Минске, а также в районе пограничного знака №***, входящего в пределы пограничной полосы Лельчицкого района Гомельской области Республики Беларусь, действуя умышленно, путем сговора и налаживания связи с неустановленным представителем вооруженного формирования – отдельного белорусского полка (до *** 2022 года — батальона) имени Кастуся Калиновского, входящего в состав Интернационального легиона территориальной обороны Вооруженных сил Украины, выполнения инструкций, сбора личных вещей, попытки незаконного пересечения Государственной границы Республики Беларусь в направлении Украины, совершил приготовление к своему участию в указанном вооруженном формировании противоборствующей стороны — Украины, военных действиях и в происходящем на ее территории вооруженном конфликте без уполномочия Республики Беларусь.*
>
> …..
>
> *Поскольку **** совершил приготовление к участию гражданина Республики Беларусь на территории иностранного государства в вооруженном формировании одной из противоборствующих сторон, а равно участию в вооруженном конфликте, военных действиях без уполномочия государства и при отсутствии признаков преступления, предусмотренного ст.133 УК (прим., “Наемничество”), его действия в этой*

*части предусмотрены и подлежат квалификации по ч.1 ст.13, ч.1 ст.361-3 УК*".

Праваабаронцам вядомыя выпадкі, калі падчас ператрусаў і допытаў сілавікі атрымлівалі доступ да тэлефонаў або ноўтбукаў затрыманых і самастойна запускалі чат-боты, у тым ліку «Перамогу» ці іншыя звязаныя ініцыятывы. Гэта дазваляла ім штучна стварыць падставу для абвінавачання. Акрамя таго, зафіксаваны выпадкі, калі сілавыя структуры стваралі падробленыя чат-боты, якія цалкам капіявалі дызайн і функцыянал арыгінальных інструментаў грамадзянскіх ініцыятыў. Такія фэйкавыя боты выкарыстоўваліся для збору дадзеных пра карыстальнікаў і наступных затрыманняў.

## Крыміналізацыя дэананімізацыі і спробаў прыцягнення да адказнасці сілавікоў

*арт. 203-1 ч.1-3, 352 ч.1-3, 130 ч.3, 179 ч.1, 364 і 365, 426 ч.2 і ч.3 КК РБ*

Пасля 2020 года разам з ростам рэпрэсій і закрытасцю дзяржаўных інстытутаў з'явіліся ініцыятывы, якія спрабавалі фіксаваць і агалошваць звесткі пра асобаў, датычных да гвалту і пераследу. Адной з такіх стала ініцыятыва «Чорная кніга Беларусі» – праект, у якім збіраліся даныя пра супрацоўнікаў сілавых структур, суддзяў, прапагандыстаў і чыноўнікаў. Для дзяржаўных органаў гэтая дзейнасць была трактаваная як "*распаўсюджанне персанальных даных*", што прывяло да масавых крымінальных спраў супраць удзельнікаў і "інфарматараў" ініцыятывы.

Удзел людзей у падобных аб'яднаннях часта меў стыхійны характар, і пытанні інфармацыйнай бяспекі заставаліся па-за ўвагай. У маі 2021 года была затрыманая Соф'я Сапега, праз камп'ютар якой сілавікі атрымалі доступ да ўліковых запісаў і перапіскі ўдзельнікаў праекта. Праз некаторы час высветлілася, што яшчэ з кастрычніка 2020 па май 2021 года ў «Чорнай кнізе Беларусі» працаваў супрацоўнік ГУБАЗіКа Артур Гайко, які фактычна кантраляваў частку камунікацыі і перадаваў інфармацыю сілавым структурам. Паводле заяў уладаў, у іх распараджэнне трапілі вялікія аб'ёмы даных, што прывяло да дзясяткаў крымінальных спраў і працяглых тэрмінаў зняволення. Паводле *Dissidentby*, як мінімум 37 чалавек былі асуджаныя ў сувязі з гэтай справай; многія атрымалі да дзесяці гадоў пазбаўлення волі.

Адным з такіх выпадкаў стаў працэс над Аляксеем Кузьміным – шматдзетным бацькам і супрацоўнікам тэлекамунікацыйнай кампаніі. Паводле матэрыялаў следства, ён меў доступ да інфармацыі пра кліентаў МТС і перадаў частку гэтых звестак у Telegram-каналы, у тым ліку ў «ЧКБ». Па гэтай справе праходзіла 57 “пацярпелых”, сярод якіх сілавікі, прапагандысты, чыноўнікі, пракуроры і члены іх сем’яў. Суд асудзіў яго на сем гадоў пазбаўлення волі. Іншы прыклад – Дзмітрый Каханоўскі, супрацоўнік Магілёўскага аддзялення “Белтэлекама”. За перадачу інфармацыі пра асобаў, датычных да рэпрэсій, ён быў асуджаны паводле трох артыкулаў КК РБ (203-1 ч.3, 130 ч.3 і 352 ч.3) на шэсць з паловай гадоў зняволення.

Нягледзячы на тое, што публікацыя асабістых звестак сапраўды супярэчыць еўрапейскім стандартам абароны персанальных даных (у тым ліку патрабаванням GDPR), у беларускім кантэксце 2020 года гэтыя дзеянні нельга разглядаць адназначна. У выпадку «Чорнай кнігі Беларусі» мэтай было не парушэнне прыватнасці, а спроба публічнай адказнасці і патрабаванне справядлівасці ў сітуацыі поўнага краху прававых механізмаў і недасягальнасці правасуддзя. Гэтыя дзеянні можна інтэрпрэтаваць як грамадзянскую рэакцыю на беспакаранасць, калі традыцыйныя каналы абароны ўнутры краіны перасталі існаваць, бо ў Беларусі не было заведзена ніводнай крымінальнай справы адносна сілавікоў.

## Рэпрэсіі супраць журналіст_ак

*арт. 361-1 ч.1-3, 361-3 ч.1-3, 369-1, 361 ч.1-3 КК РБ*

Журналісцкая дзейнасць у Беларусі таксама апынулася пад татальным кантролем дзяржавы. Паводле дадзеных Беларускай асацыяцыі журналістаў (БАЖ), на канец 2025 года 43 медыя-праекты і рэдакцыі атрымалі статус *“экстрэмісцкіх фармаванняў”*, юрыдычнае азначэнне, якое дазваляе крыміналізаваць любы ўдзел у іх працы або ўзаемадзеянне з імі. Гэта азначае, што журналісты і тэхнічныя супрацоўнікі могуць быць прыцягнутыя да адказнасці нават у выпадку, калі на момант прызнання СМІ “экстрэмісцкім” яны ўжо не мелі дачынення да яго дзейнасці.

Паводле *Dissidentby*, не менш за 76 журналіст_ак былі рэпрэсаваныя. Толькі ў 2024 годзе, паводле БАЖ, 30 чалавек сталі фігурантамі крымінальных спраў, 66 перажылі вобшукі, а 19 былі прыцягнутыя да адміністрацыйнай адказнасці. У 2025 годзе колькасць вобшукаў павялічылася да 34 выпадкаў, і яшчэ 4 чалавекі былі асуджаныя паводле адміністрацыйных артыкулаў.

Адзін з першых гучных выпадкаў крымінальнага пераследу журналістаў – [справа супрацоўніц тэлеканала «Белсат» Кацярыны Бахвалавай і Дар’і Чульцовай](), затрыманых падчас стрыму з стыхійнай акцыі памяці Рамана Бандарэнкі ў лістападзе 2020 года. На той момант рэпрэсіі супраць медыя яшчэ не былі інстытуцыяналізаваныя, таму абвінавачанне будавалася не на “экстрэмісцкіх” артыкулах, а па арт. 342 КК РБ. Пазней падобныя падыходы пашырыліся і журналіста_к сталі пераследаваць не толькі за асвятленне падзей, але і за меркаваныя “падатковыя парушэнні”. Напрыклад, ужывалася арт. 243 КК РБ, што дазваляла распраўляцца з незалежнымі медыя пад выглядам эканамічных злачынстваў.

Пачынаючы з 2021 года, рэпрэсіі супраць журналіста_к набылі сістэмны і прававы характар. Матэрыялы незалежных выданняў, публікацыі ў сацыяльных сетках і нават каментары сталі прызнавацца “экстрэмісцкімі матэрыяламі”, а самі медыя “экстрэмісцкімі фармаваннямі”. Гэта азначала, што журналісцкая дзейнасць у Беларусі стала прыраўноўвацца да “злачынстваў экстрэмісцкай накіраванасці”, а артыкулы 361-1, 361-3, 369-1 і 361 КК РБ сталі асноўнымі інструментамі для крымінальнага пераследу прадстаўні_ц медыя і аўтаматычнае пазбаўленне іх права на прафесію.

У беларускіх рэаліях “экстрэмісцкае заканадаўства”ператварылася ў універсальны інструмент знішчэння прафесійных супольнасцяў, якія валодаюць уласнымі каналамі камунікацыі і ўплыву. Праз прызнанне незалежных медыя “экстрэмісцкімі фармаваннямі” дзяржава ліквідавала апошнія асяродкі незалежнай журналістыкі і свабоднай інфармацыі. Пры гэтым аналагічныя механізмы ўжываюцца і да іншых груп такіх як праваабаронцы, юрысты, валанцёры. Такім чынам, паняцце “экстрэмізму” ў беларускім кантэксце страціла сваю юрыдычную выразнасць і стала азначаць любую форму самастойнай грамадзянскай дзейнасці, якая выходзіць па-за дзяржаўны кантроль.

## Рэпрэсіі супраць сваякоў палітзняволеных

*арт. 361-4 КК РБ*

На працягу апошніх двух гадоў у Беларусі сфармавалася новая тэндэнцыя рэпрэсій – прыцягненне да крымінальнай адказнасці сваякоў палітвязняў. Калі раней дзяржава канцэнтравалася на непасрэдных удзельні_ц пратэстаў ці актывіста_к, то цяпер аб’ектам пераследу становяцца блізкія асобы тых, хто ўжо пацярпеў ад рэжыму. Найчасцей падставай для крымінальных спраў становяцца інтэрв’ю незалежным медыя, прызнаным “*экстрэмісцкімі*

*фармаваннямі*". Пры гэтым час публікацыі не мае значэння, нават размовы двухгадовай даўніны могуць быць выкарыстаныя як падстава для абвінавачання.

Адным з першых прыкладаў стала справа Дар'і Лосік, жонкі былога палітвязня, журналіста Ігара Лосіка. Дар'я публічна займалася падтрымкай мужа і выхоўвала іх дачку. За інтэрв'ю тэлеканалу *Белсат*, прызнанаму "экстрэмісцкім фармаваннем", яна была асуджаная на два гады пазбаўлення волі. Гэты выпадак стаў сігналам для іншых сем'яў палітвязняў, што любая камунікацыя з незалежнымі медыя цяпер можа расцэньвацца як "садзейнічанне экстрэмісцкай дзейнасці". Улетку 2024 года адбыліся падобныя затрыманні Таццяны Францкевіч і Наталлі Лабацэвіч, маці палітвязняў. Сыны абедзвюх жанчын ужо былі рэпрэсаваныя: сын Наталлі Ілья адбыў пакаранне за ўдзел у пратэстах і ў 2022 годзе пакінуў Беларусь, а сын Таццяны быў асуджаны на 18 гадоў зняволення. Абедзве жанчыны ў 2020–2022 гадах публічна падтрымлівалі сваіх дзяцей, а праз некалькі гадоў былі затрыманыя за гэта. Паводле следства, падставай сталі два інтэрв'ю тэлеканалу *Белсат*, пасля чаго Наталлю Лабацэвіч асудзілі на тры гады, а Таццяну Францкевіч на тры гады і тры месяцы пазбаўлення волі. Акрамя гэтага, шмат сваякоў цяперашніх палітзняволеных былі вымушаны пакінуць краіну пад пагрозай пераследу і знаходзяцца ў базе вышуку.

Такім чынам, палітычныя рэпрэсіі ператвараюцца ў калектыўнае пакаранне, калі цярпяць не толькі непасрэдныя ўдзельнікі падзей, але і іх сем'і. Дзяржава выкарыстоўвае крымінальны пераслед сваякоў як інструмент дадатковага ціску, каб ізаляваць палітвязняў, пазбавіць іх падтрымкі і стварыць атмасферу татальнага страху. У шэрагу выпадкаў улады канфіскуюць або прымусова прадаюць маёмасць асуджаных, што фактычна ператварае рэпрэсіі ў пакаранне ўсёй сям'і. У выніку многія апынаюцца раз'яднанымі паміж рознымі краінамі, без магчымасці бачыцца, дапамагаць адно аднаму або адкрыта гаварыць пра свой досвед. Гэтая практыка дэманструе, што беларуская сістэма рэпрэсій выходзіць за межы індывідуальнага пераследу і ператвараецца ў інструмент калектыўнага запалохвання і разбурэння сацыяльных сувязяў.

## Статыстыка 2020-2025. Прававы каментар

Статыстыка адлюстроўвае колькасць выпадкаў, калі следчыя органы кваліфікавалі дзеянні жахара_к краіны паводле адпаведных артыкулаў Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь. У шэрагу спраў фігуруе некалькі артыкулаў адначасова, таму агульная колькасць выпадкаў перавышае

колькасць асобаў, прыцягнутых да адказнасці. Паводле праваабарончай ініцыятывы *Dissidentby*, усяго не менш як **3476 чалавек** былі асуджаныя па крымінальных справах за дзеянні, звязаныя з анлайн-актыўнасцю, з якіх у 2799 чалавек фігуравалі абвінавачванні, звязаныя з выказваннем меркавання ў сацыяльных сетках, а ў 997 - актыўнасць і ўдзел у лічбавых ініцыятывах.

| **Артыкул КК РБ** | **Кваліфікацыя** | **Колькасць выпадкаў ужывання артыкула за 2020-2025*** |
|---|---|---|
| Арт. 367 ч1, 2 | Паклёп у адносінах да Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь | 328 |
| Арт. 368 ч.1, 2 | Абраза Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь | 1186 |
| Арт. 369 | Абраза прадстаўніка ўлады | 1357 |
| Арт. 391 | Абраза суддзі або народнага засядацеля | 115 |
| Арт. 369-1 | Дыскрэдытацыя Рэспублікі Беларусь | 72 |
| Арт. 130 ч. 1-3 | Распальванне расавай, нацыянальнай, рэлігійнай або іншай сацыяльнай варожасці ці розні | 823 |
| | | |
| Арт. 179 ч.1 (выключана з КК РБ) | Незаконны збор і распаўсюджванне звестак пра прыватнае жыццё | 23 |
| Арт. 426 ч.1-3 | Перавышэнне ўлады або службовых паўнамоцтваў | 21 |
| Арт. 361-2 ч.1, 2 | Фінансаванне экстрэмісцкай дзейнасці | 150 |
| Арт. 361-3 ч.1, 2 | Удзел на тэрыторыі замежнай дзяржавы ў узброеным фарміраванні або ўзброеным канфлікце, ваенных дзеяннях, | 80 |

| | | |
|---|---|---|
| | вярбоўка або падрыхтоўка асоб для такога ўдзелу | |
| Арт. 361-4 ч.1, 2 | Садзейнічанне экстрэмісцкай дзейнасці | 430 |
| Арт. 290-1 ч.1, 2 | Фінансаванне тэрарыстычнай дзейнасці | 36 |
| Арт. 361-1 ч.1-3 | Стварэнне экстрэмісцкага фармавання або ўдзел у ім | 359 |
| Арт. 203-1 ч.1-3 | Незаконныя дзеянні ў дачыненні да інфармацыі пра прыватнае жыццё і персанальныя даныя | 91 |
| Арт. 352 ч.1-3 (выключана з КК РБ) | Неправамернае завалоданне камп'ютарнай інфармацыяй | 23 |

**Адлюстроўвае колькасць выпадкаў, дзе артыкул быў выкарыстаны ў кваліфікацыі дзеянняў (у аднаго чалавек можа фігураваць некалькі артыкулаў у абвінавачванні).*Міжнародныя стандарты[4] патрабуюць, каб любыя абмежаванні свабоды выказвання і камунікацыі адначасова былі прадугледжаныя ясным і прадказальным законам, мелі законную і доказную мэту (напрыклад, абарона правоў іншых або бяспекі) і заставаліся найменш абмежавальным сродкам для яе дасягнення. Гэты так званы *трохступенчаты тэст* (законнасць, неабходнасць, прапарцыянальнасць) з'яўляецца ўніверсальным крытэрыем ацэнкі абмежаванняў свабоды выказвання паводле арт. 19 МПГПП і арт. 10 ЕКПЧ.

**У практычным сэнсе:**

- **Законнасць (legality)** азначае, што абмежаванні павінны быць замацаваныя ў законе, які дастаткова ясны, прадказальны і дае чалавеку разуменне, калі і за што яго могуць абмежаваць. Калі паняцці закону занадта шырокія ці ацэначныя, гэта стварае рызыку самавольнага прымянення і фактычна робіць кожнага патэнцыйна вінаватым.

---

[4] *МПГПП*, арт. 19 і 17 — https://www.ohchr.org/en/instruments-mechanisms/instruments/international-covenant-civil-and-political-rights;
*ЕКПЧ*, арт. 10 і 8 — https://www.echr.coe.int/documents/d/echr/convention_eng;
*Генеральны каментар № 34* — https://docs.un.org/en/CCPR/C/GC/34

- **Неабходнасць (necessity)** патрабуе, каб абмежаванне сапраўды мела законную мэту, напрыклад, абарону нацыянальнай бяспекі, грамадскага парадку, здароўя або правоў іншых асоб, і каб у дэмакратычным грамадстве існавала рэальная пагроза, якая апраўдвае такое ўмяшанне.

- **Прапарцыянальнасць (proportionality)** азначае, што выбраныя меры павінны быць найменш абмежавальнымі для дасягнення мэты; дзяржава павінна разглядаць альтэрнатывы, якія менш шкодзяць свабодзе выказвання.

У Беларусі патрабаванні міжнародных стандартаў свабоды выказвання сістэмна ігнаруюцца. Абмежаванні выкарыстоўваюцца пераважна як сродак кантролю над інфармацыяй і грамадзкай актыўнасцю, а не для абароны законных інтарэсаў:

**Законнасць.** Такія ключавыя складнікі, як *«дыскрэдытацыя дзяржавы»*, *«садзейнічанне экстрэмісцкай дзейнасці»*, *«абраза»*, сфармуляваныя занадта шырока і ацэначна; у прысудах фігуруюць неюрыдычныя катэгорыі кшталту *«агульначалавечая мараль»* або *«падрыў аўтарытэту ўлады»*, што не адпавядае патрабаванням прадказальнай і дакладнай нормы.

**Неабходнасць.** Крымінальныя справы за каментары, данаты, падпіскі ці рэгістрацыю ў ботах не дэманструюць наяўнасці рэальнай пагрозы бяспецы і пераследуюць не ахоўную, а палітычную мэту як падаўленне крытыкі і салідарнасці з рэпрэсаванымі.

**Прапарцыянальнасць.** Рэальныя тэрміны зняволення за выказванні, сімвалічныя peralікі і тэхнічныя дзеянні ў сетцы выглядаюць празмернымі і маюць эфект запалохвання. Пры гэтым менш абмежавальныя сродкі дзяржавай не разглядаліся (напрыклад арт. 10.2 КаАП РБ “Абраза”).

Права на прыватнае жыцце паводле арт. 17 МПГПП і рэгламента ЕС аб абароне даных у кантэксце бяспекі прыватных звестка таксама закранаюцца. Падчас затрыманняў у сілавікоў з’яўляецца доступ да тэлефонаў і ўліковых запісаў без эфектыўнага судовага кантролю; ствараюцца і выкарыстоўваюцца фэйкавыя чат-боты і каналы для выяўлення карыстальнікаў; праводзіцца пашыраны маніторынг і дэананімізацыйныя праверкі (суаднясенне нікаў, фатаграфій, метаданых). Такія практыкі прыводзяць да непрапарцыйнага ўмяшання ў прыватнае жыццё і неабгрунтавана абмяжоўваюць свабоду камунікацыі. У міжнародным кантэксце адпаведныя стандарты вызначае Агульны рэгламент ЕС аб абароне даных (GDPR), які патрабуе мінімізацыі і законнасці апрацоўкі асабістай інфармацыі. Хоць Беларусь не з’яўляецца яго

ўдзельніцай, гэтыя прынцыпы застаюцца арыенцірам для ацэнкі парушэнняў прыватнасці.

# Заключэнне. Наступствы і тэндэнцыі

Прававая карціна, апісаная вышэй, складаецца са штодзённана досведу людзей, супольнасцяў і арганізацый. Крыміналізацыя выказванняў у анлайн-прасторы, падтрымкі ініцыятыў або нават простага спажывання інфармацыі мае канкрэтныя сацыяльныя наступствы, якія змяняюць паводзіны і структуру грамадства. Ніжэй апісаны некаторыя тэндэнцыі і формы паводзін, што ўзнікаюць у выніку гэтых “лічбавых рэпрэсій” і адлюстроўваюць адаптацыю супольнасцяў да пастаяннай рызыкі і кантролю.

## Самацэнзура праз “лічбавы страх”

Крыміналізацыя каментароў, падпісак і данатаў прывяла да масавага стрымлівання выказванняў: людзі выдаляюць старыя пасты і каментары (з’яўляюцца нават ініцыятывы якія займаюцца дапамогай у пошуку каментараў для наступнага выдалення), закрываюць акаўнты, пазбягаюць рэакцый і падпісак на каналы, пазначаныя як “экстрэмісцкія”. Сістэмнае выдаленне кантэнту і самацэнзура прыводзяць да страты грамадствам уласных сведчанняў пра рэпрэсіі і ключавыя грамадзкія працэсы. Без публічных слядоў мінулае становіцца менш відавочным, а пераасэнсаванне гістарычных падзей практычна немагчымым, што адкрывае шлях да іх перапісвання ў патрэбным ідэалагічным накірунку. Гэта прыводзіць да знікнення значнай часткі гісторыі палітычна-сацыяльнага жыцця ў краіне, робіць анлайн-прастору прагназуема маўклівай, і сцірае лічбавы след рэпрэсій.

## Выціскання за мяжу і фрагментацыя супольнасцяў

Рызыка крымінальнага пераследу штурхае актывіст_ак, журналіста_к, праваабаронцаў і іх сем’і да вымушанай эміграцыі. Гэта прыводзіць да фрагментацыі грамадзянскай супольнасці, дзе частка застаецца ўнутры краіны пад пастаянным кантролем, а частка працягвае працу за мяжой, але без магчымасці бяспечна камунікаваць з тымі, хто ў Беларусі.

Пастулова ўзнікае інфармацыйны разрыў, калі людзі ўнутры краіны маюць абмежаваны доступ да заблакаваных медыя і не могуць свабодна чытаць або

каментаваць іх матэрыялы, у той час як супольнасці ў выгнанні жывуць у іншай інфармацыйнай рэальнасці. Гэта не толькі падрывае адзінства, але і стварае “двайную ізаляцыю”: незалежныя СМІ і ініцыятывы пазбаўленыя магчымасці атрымліваць каментары і сведчанні знутры, а людзі ўнутры краіны – магчымасці быць пачутымі. Акрамя таго, праз прызнанне медыя “*экстрэмісцкімі фармаваннямі*” і фактычную забарону прафесійнай дзейнасці многія журналіст_кі страцілі права на прафесію і вымушаныя працаваць ананімна або пакінуць краіну.

## Перанос актывізму ў “цёмныя зоны”

Пасля зачышчэння адкрытых пляцовак камунікацыя і арганізатарская праца зрушыліся ў зашыфраваныя каналы і закрытую інфраструктуру, дзе выкарыстоўваюцца VPN, Tor, сакрэтныя чаты і механізмы скразнога шыфравання. Аперацыйная бяспека стала неад’емнай часткай грамадзянскай актыўнасці, але кошт удзелу ў ёй істотна вырас. Каб проста прачытаць навіны або паглядзець відэа, цяпер трэба карыстацца тэхналогіямі абыходу блакіровак, ананімнымі ўкладкамі, чысціць гісторыю праглядаў, адключаць геалакацыю і адпісацца ад каналаў пасля прачытання.

## Лічбавы разрыў

Гэта ўскладняе доступ да інфармацыі і робіць яго няроўным. Людзі з меншымі тэхнічнымі ведамі або без дастатковага досведу (асабліва падлеткі і студэнты) рызыкуюць сутыкнуцца з рэпрэсіямі, не ўсведамляючы наступстваў сваіх дзеянняў. , напрыклад, калі яны робяць рэакцыю ці каментар пад “*экстрэмісцкай*” публікацыяй. У выніку моладзь усё часцей звяртаецца да “бяспечных” каналаў, дзе інфармацыя падаецца ў прапагандысцкім фармаце, а забароненыя медыя вымушаны публікаваць кантэнт без свайго брэнду, каб трапіць да непалітызаванай аўдыторыі.

Для старэйшага пакалення сітуацыя яшчэ складаней: многія пенсіянеры і людзі сталага ўзросту не валодаюць навыкамі лічбавай бяспекі і таму свядома адмаўляюцца ад чытання альтэрнатыўных СМІ, каб пазбегнуць рызыкі. Гэта вядзе да інфармацыйнай ізаляцыі шырокіх груп насельніцтва і ўзмацняе разрыў паміж пакаленнямі, як па ўзроўні даверу, так і па разуменні рэчаіснасці.

## Сістэмныя рэпрэсіі супраць анлайн-актыўнасці

Канвеерныя рашэнні аб прызнанні каналаў і ініцыятыў "*экстрэмісцкімі*" і рэгулярнае папаўненне спісаў "*экстрэмісцкіх матэрыялаў*" і "*экстрэмісцкіх фармаванняў*" фармуюць устойлівую адміністратыўна-прававую матрыцу, у якой любая непадкантрольная камунікацыя можа быць перакваліфікаваная ў злачынства ў любы момант. Сістэма працуе на аснове адвольных і непразрыстых крытэрыяў, што супярэчыць прынцыпу прававой вызначанасці. Так, у прысудах па "данатах" суды прызнавалі вінаватымі людзей, якія на момант пераліку сродкаў не маглі ведаць пра статус атрымальніка. У адным з такіх рашэнняў суд адзначыў, што *«о деструктивности данного формирования свидетельствует информация, размещенная в свободном доступе в интернете»*, фактычна замяняючы законныя нормы суб'ектыўнай ацэнкай "*деструктивности*". Такім чынам, межы дазволенага дзеяння пастаянна змяняюцца заднім числом, што дэманструе поўную адвольнасць прымянення крымінальнага заканадаўства ў дачыненні да анлайн-актыўнасці.

## Інфармацыйная дэфіцытнасць

Сістэмныя блакіроўкі, маркіроўкі незалежных СМІ як "*экстрэмісцкіх*" і страх карыстацца адкрытымі крыніцамі ствараюць хранічны дэфіцыт праверанай інфармацыі. Людзі, пазбаўленыя бяспечнага доступу да альтэрнатыўных медыя, вымушаныя абмяжоўвацца дзяржаўнымі каналамі або выпадковымі ананімнымі рэсурсамі. Паступова фарміруецца прывучанасць да фрагментарнай інфармацыі, калі замест цэласнай карціны падзей людзі бачаць толькі абрыўкі, чуткі і пераказы, што павышае ўразлівасць грамадства да прапаганды і дэзінфармацыі., што павышае ўразлівасць грамадства да прапаганды і дэзінфармацыі.

## Выцясненне з грамадзянскай актыўнасці

Пастаянны страх перад магчымымі наступствамі прымушае многіх людзей не толькі маўчаць, але і цалкам адмаўляцца ад удзелу ў любой грамадзянскай або валанцёрскай дзейнасці. Людзі перастаюць падпісвацца на ініцыятывы, не ўдзельнічаюць у зборах сродкаў, не падпісваюць петыцыі і нават пазбягаюць размоў на сацыяльна-палітычныя тэмы ў анлайне. Гэта прыводзіць да паступовай страты культуры ўдзелу і салідарнасці. Калі раней удзел у анлайн-супольнасцях быў спосабам праяўляць грамадзянскую

пазіцыю, то цяпер ён успрымаецца як патэнцыйная рызыка. У выніку людзі пераносяць сваю актыўнасць у прыватную сферу, дзе яна застаецца нябачнай для супольнасці і праваабаронцаў, што ўскладняе фіксацыю парушэнняў і дапамогу пры затрыманнях. Іншыя выбіраюць поўны неўдзел, што аслабляе грамадзянскую салідарнасць і скарачае магчымасці для калектыўнага дзеяння.

Нават ва ўмовах паглыблення кантролю, захаванне і дакументаванне праўды пра рэпрэсіі застаецца асновай грамадзянскай устойлівасці. У сітуацыі, калі анлайн-супраціў сутыкаецца з анлайн-прыгнетам, фіксацыя фактаў і іх перадача праз незалежныя каналы становіцца адной з формаў адказу на гвалт. Яшчэ адзін, цалкам практычны адказ на лічбавыя пагрозы – павышэнне ўзроўню тэхналагічнай граматнасці і культуры халістычнай бяспекі. Выкарыстанне шыфраваных сродкаў сувязі, адказнае стаўленне да асабістых дадзеных, а таксама разуменне рызык, звязаных з анлайн-актыўнасцю, робяць існаванне ва анлайн-прасторы (адносна) больш бяспечным. Умацаванне гэтых навыкаў, нажаль, не ліквідуе рэпрэсій, якія ў тым ліку базуюцца на выкарыстанні лічбавых тэхналогій, але пашырае прастору дзеяння для грамадзянскай супольнасці. Акрамя індывідуальных намаганняў, неабходная каардынацыя і абмен ведамі паміж арганізацыямі, што працуюць у сферы правоў чалавека, лічбавай бяспекі і медыяадукацыі. Гэта стварае сетку салідарнасці, здольную хутчэй рэагаваць на новыя формы пагроз, падтрымліваць людзей, якія трапляюць пад ціск, і працаваць на папярэджанне рэпрэсій.

DISSIDENTBY

Human constanta